Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

27 КРАСАВІКА 2023 г. ЧАЦВЕР № 79 (29959)

У КОЖНАЙ ВЫКАНАЎЦЫ – СВАЯ ЖЫЗЕЛЬ

ЧЫРВОНКА

ШЛЯХАМ ІНАВАЦЫЙ І ВЫСОКІХ ТЭХНАЛОГІЙ ЧЫРВОНКА

ЦЫТАТА ДНЯ

Ігар ПЕТРЫШЭНКА, намеснік прэм'ер-міністра:

«Да пачатку ўступнай кампаніі ў нашай краіне ўсё гатова. Вызначаны 144 пункты па ўсёй Беларусі. Кожны ведае сваю задачу на час правядзення ўступных іспытаў. Цяпер ідзе працэс падачы і афармлення заяў і выпускнікамі, і прадпрыемствамі — заказчыкамі кадраў. На сайтах нашых ВНУ з 1 мая будзе размешчана інфармацыя аб колькасці месцаў для мэтавага паступлення ва ўніверсітэты. Абітурыентам трэба будзе толькі здаць вусны або творчы ўступны экзамен. Сёлета плануецца каля 52 тысяч месцаў, з якіх крыху больш за 28 тысяч — бюджэтная аснова, і прыкладна 23 тысячы — платная. Матываваць да павелічэння колькасці бюджэтных месцаў стала неабходнасць разгледзець яшчэ больш матываваных дзяцей і з улікам узроўню іх ведаў забяспечыць паступленне ў навучальныя ўстановы. Таксама мы плануем прыёмныя кампаніі ў сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы».

Каля вытокаў гуллівай вады

Фота Віктара ВАЙЧЫКАВА.

Традыцыйна ў сталіцы перад майскімі святамі пачынаецца сезон фантанаў. А ў гэтыя дні прафесіяналы рыхтуюць іх даволі складаныя інжынерныя сістэмы да запуску. Напрыклад, спецыялісты ўчастка эксплуатацыі гарадскіх фантанаў «Мінскзелянбуда» — вядучы інжынер Уладзіслаў НЕЎМЯРЖЫЦКІ і электраманцёр Аляксандр ХАЛІМОНЕЦ — даводзяць да ладу «сэрца» фантана каля кінатэатра «Масква» на праспекце Пераможцаў.

Моцныя рэгіёнамі

У ЮБІЛЕЙНЫ ГОД — НА ДОШЦЫ ГОНАРУ

Дзятлаўскі раён — у ліку пераможцаў рэспубліканскага спаборніцтва

Такі высокі тытул атрыманы за дасягненне высокіх паказчыкаў у сацыяльна-эканамічным развіцці за 2022 год. Для месцічаў узнагарода асабліва значная, бо сёлета раённы цэнтр адзначае юбілейную дату — 525 гадоў заснавання горада Дзятлава. І да гэтай даты тут падышлі з высокімі паказчыкамі. Аб тым, што паспрыяла такому поспеху і новых магчымасцях Дзятлаўскага раёна гутарым са старшынёй райвыканкама Андрэем САДОЎСКІМ.

— Андрэй Уладзіміравіч, паколькі ў спаборніцтве ацэньваліся дасягненні мінулага года, якія вы б адзначылі ў ліку важных?

— Мінулы год быў багаты на знакавыя падзеі для Дзятлаўскага раёна. Перад намі стаялі складаныя задачы, якія можна лічыць праверкай на трываласць. Але тым больш радасна ад таго, што многае ўдалося дасягнуць. Забяспечана стабільнае сацыяльна-эканамічнае развіццё рэгіёна, амаль удвая павялічыўся экспарт, на 120 % выраслa заработная плата, такія ж тэмпы росту назіраліся ў аб'ёме інвестыцый у асноўны капітал. За мінулы год раён атрымаў 57 мільёнаў рублёў чыстага прыбытку, або 201,3 % да ўзроўню 2021 года.

Зроблены значны рывок у будаўніцтве жылля. За мінулы год уведзена ў эксплуатацыю больш як 3,6 тысячы «квадратаў» — як новых, так і пасля рэканструкцыі нежылых будынкаў.

СТАР. 3

Надзённы клопат

СЯЎБА Ў «ВАЗНЯСЕНСКУ»,

або Калі не заробіш у майцы, то не заробіш і ў фуфайцы

На Гомельшчыне вялікая паводка і зацяжныя дажджы ўнеслі карэктывы ў тэмпы пасяўных стартаў. Аграрыі некаторых гаспадарак вымушаныя былі распачаць сяўбу на часткова падтопленых палях і чакаць, калі вада цалкам сыдзе. Цяпер жа дадатковы выклік для аграрыяў рэгіёна — налажэнне шэрагу сельгасзадач: завяршэнне сяўбы ранніх яравых культур і працяг пасяўной кукурузы. Першае паўднёва-ўсходні рэгіён плануе завяршыць да 1 мая. Сяўба ж кукурузы ў вобласці павінна быць завершана да 20 мая. Сёння аграрыі Гомельшчыны выкарыстоўваюць увесь светлавы дзень, задзейнічаюць максімальна эфектыўна кожны пасяўны ўчастак. За сяўбой царыцы палёў карэспандэнт «Звязды» паназірала ў гаспадарцы Чачэрскага раёна.

СТАЎКА НА КУКУРУЗУ І ТЭХНАЛОГІІ

Зерне кукурузы — для асфальтавага рамантыка яно падобнае на дражэ манпансье — засыпаюць у секцыі новенькай кукурузнай сеялкі. Яно апрацаванае і патрабуе захавання правілаў абыходжання з ім. Нюансы работы тлумачаць супрацоўнікі сельгаспрадпрыемства «Вазнясенск». Менавіта гэтая гаспадарка Чачэрскага раёна летась правяла ўражальны эксперымент па вырошчванні сланечніку. Сёлета сярод адкрыццяў мясцовых аграрыяў і іншыя культуры. Але пакуль што значная ўвага аддаецца кукурузе. Ва ўрочышчы Новыя Малынічы якраз рыхтуюцца сеяць яе на зерне: працуюць з сеялкай дакладнага высеву. Машына — новая для гаспадаркі. Яна дае магчымасць са стапрацэнтнай дакладнасцю вытрымаць неабходную адлегласць паміж будучымі парасткамі.

Поўнай загрузкі сеялкі хопіць, каб прайсці каля чатырох гектараў. За працоўную змену механізатар можа засеяць кукурузай каля сарака гектараў. Але каб не траціць бясцэнны час, у загрузцы насення абавязкова дапамагае яшчэ адзін работнік.

СТАР. 4

КАРАТКА

- **Пасяджэнне аргкамітэта па падрыхтоўцы і правядзенні 30-га Дня беларускага пісьменства ў Гарадку прайшло ў Мінску.**
- Стаўка рэфінансавання зніжаецца да 10 працэнтаў гадавых з 2 мая.
- **Апошні населены пункт Беларусі выйдзе з зоны радыеактыўнага забруджвання да 2090 года.**

ISSN 1990 — 763X

«Усё, што пабудавана і створана, будзе працаваць»

Наталля Качанава наведала з рабочай паездкай Дзяржынскі раён

Спікер верхняй палаты парламента азнаёмілася з вытворчасцю ТАА «Медывайс» і правяла рабочую нараду з кіраўніцтвам прадпрыемства. Не засталося па-за ўвагай Наталлі Качанавай і будаўніцтва фізкультурна-аздараўленчага комплексу, мікрараёна новай жылой забудовы, інжынернай і транспартнай інфраструктуры, установы сярэдняй адукацыі ў Фаніпалі. Засталася пад уражаннем Старшыня Савета Рэспублікі і пасля наведвання дзіцячага садка № 6 горада-спадарожніка.

«ГЭТЫЯ ВЫТВОРЧАСЦІ НЕ ПРАПАДУЦЬ»

Асноўны від дзейнасці прадпрыемства «Медывайс», са знаёмства з якім пачаўся візіт Наталлі Качанавай у Дзяржынскі раён, — вытворчасць медыцынскага і стаматалагічнага абсталявання, інструментаў і прылад, не ўключаных у іншыя групы. У прыватнасці, тут вырабляюцца шпрыцы, іголкі, катэтары, канюлі, афтальмалагічныя інструменты і прыстасаванні.

Як удакладніў **дырэктар «Медывайс» Юрый ПАНОЎ**, да нядаўняга часу гэта была кампанія «Унамедыкал», якая з'яўлялася часткай карпарацыі «Канватэк». У красавіку мінулага года «Канватэк» прыняла рашэнне аб сыходзе з рынку Расіі і Беларусі — 31 мая 2022-га завод спыніў аперацыйную дзейнасць. «Мы вырашылі прапанаваць «Канватэку» больш рацыянальнае рашэнне і даць яму другі шанц, — адзначыў Юрый Паноў. — Наша просьба была пачутая, і нам далі магчымасць выйсці са складу каманды, выкупіць гэтае прадпрыемства. Два тыдні таму мы атрымалі восем грузавікоў новага тэхналагічнага абсталявання. Яно дазволіць нам з 600 пазіцый, якія выраблялі да спынення, яшчэ дадаць каля 40 новых, чым мы цяпер і займаемся».

Наталля Качанава расказала, што да яе на прыём па асабістых пытаннях прыйшоў кіраўнік прыватных медыцынскіх цэнтраў і сказаў, што ёсць гатоўнасць купіць прадпрыемства, якое пакінулі замежныя інвестары, або аднавіць вытворчасць на ім. Прадпрыемства працавала дастаткова доўга ў нашай краіне, прычым паспяхова. «Пасля таго як былі ўведзены санкцыі, яны (замежныя інвестары. — **Заўв. БелТА**) пакінулі яго і з'ехалі, — удакладніла Старшыня Савета Рэспублікі. — Засталіся людзі, засталося прадпрыемства, і сёння прыйшлі нашы беларускія бізнесмены, якія аднавілі вытворчасць, вельмі патрэбную для нашай краіны».

Плануецца, што на прадпрыемстве будзе выпускацца звыш 650 медыцынскіх найменняў. «Людзі, якія працавалі на ім (іх было каля 300 чалавек) ужо чакаюць, калі яно поўнасцю запрацуе, — адзначыла Наталля Качанава. — Засталося толькі ўрэгуляваць некаторыя пытанні, якія датычацца сертыфікацыі, таму што, на жаль, калі праводзілася гэтая здзелка, свае гарантыі еўрапейскія партнёры не выканалі. Мы дакладна ведаем, што еўрапейскі рынак таксама зацікаўлены ў такіх вырабах. Ёсць ужо і заключаныя кантракты. Таму самыя добрыя перспектывы ў дадзенага прадпрыемства, тут няма ніякага сумнення. І гэта яшчэ адно з даручэнняў Прэзідэнта. І тое, пра што казаў кіраўнік дзяржавы ў Пасланні беларускаму народу і парламенту: сыходзяць — нехай сыходзяць. Гэтыя вытворчасці не прападуць. Усё, што было пабудавана, створана ў Беларусі, будзе працаваць і функцыянаваць. Нідзе нічога кінута не будзе».

Кажучы пра імпартазамяшчэнне, Старшыня Савета Рэспублікі адзначыла, што ў яе няма ніякага сумнення ў тым, што мы можам рабіць усё неабходнае сёння для нармальнага жыцця нашай краіны, нашых грамадзян. «За выключэннем выпадкаў, калі эканамічна немэтазгодна выпускаць той ці іншы від вырабаў, якія не выпускаюцца ў нашай краіне», — дадала яна.

Спікер падкрэсліла: у напрамку імпартазамяшчэння ў Беларусі наладжна цесная кааперацыя з Расійскай Федэрацыяй. «Вы ведаеце, што ў рамках Саюзнай дзяржавы ў нас рэалізоўваюцца праграмы ў прамысловасці, сельскай гаспадарцы — гэта значыць, мы сёння актыўна працуем па ўсіх тых кірунках, — паведаміла Наталля Качанава. — Што датычыцца нашай краіны, я ўпэўненая і проста бачу сама, наведваючы прадпрыемствы, сустракаючыся з людзьмі, што мы можам забяспечыць сябе самі практычна ўсім неабходным, яшчэ раз паўтарыся, для грамадзян і нашай краіны ў цэлым».

«ВАЖНА МЕНАВІТА З ДЗІЦЯЧАГА САДКА ПРЫВІВАЦЬ ЛЮБОЎ ДА СВАЁЙ КРАІНЫ»

Як падкрэсліла ў размове з журналістамі Старшыня Савета Рэспублікі, гарады-спадарожнікі павінны развівацца. «Гэта тая задача, якую паставіў Прэзідэнт нашай краіны, — удакладніла Наталля Качанава. — Ды і мы бачым, што развіваць без канца Мінск, як сталіцу нашай краіны, або абласныя цэнтры няма неабходнасці, як і канцэнтраваць усіх людзей у такіх буйных мегаполісах. Гэта становіцца некамфортна для жыхароў вялікіх гарадоў. А вось развіваць гарады-спадарожнікі вельмі важна. І мы бачым сёння, напрыклад, у Смалявічах, як жыхары Мінска з задавальненнем будуюць жыллё і пераязджаюць жыць у такія гарады-спадарожнікі».

Спікер верхняй палаты парламента прызналася, што ў Фаніпалі знаходзіцца ўпершыню. Самыя прыемныя ўражанні ў яе засталіся пасля наведвання дашкольнай установы — дзіцячага садка № 6, які быў адчынены ў верасні мінулага года. «Калі тут працуюць вытворчасці і прадпрыемствы — значыць, ёсць работа, — звярнула ўвагу Наталля Качанава. — Можна жыць, працаваць, атрымліваць дастойную заработную плату, будаваць жыллё. Акрамя таго, тут ёсць такія выдатныя сацыяльныя аб'екты, як гэтая дашкольная ўстанова, дзе, на мой погляд, створаны цудоўныя ўмовы для развіцця дзетак».

— Прывіваць любоў да краіны важна з дзяцінства, — лічыць Наталля Качанава. — Пачуццё патрыятызму, калі ты жывеш з любоўю да сваёй радзімы, дае чалавеку магчымасць жыць камфортна. На ўласным досведзе як маці і як бабуля ведаю, што дзіця з самага ранняга ўзросту ўбірае тую інфармацыю, якая яму цікавая, у тым ліку тую, якая датычыцца нашай краіны. Я вельмі рада, што ў гэтай дашкольнай установе ёсць такі цэнтр, дзе займаюцца патрыятычным выхаваннем нашых дзетак. Сёння дзеці іншыя, шмат ведаюць, разумеюць, шмат часу праводзяць у інтэрнэце. Напэўна, бацькам так зручна, калі ты даў яму тэлефон або планшэт, нават нягледзячы на ўзрост, і дзіця спакойна сядзіць там. Але якую інфармацыю ён там атрымлівае? Гэта вялікае пытанне. Таму вельмі важна менавіта з ранняга ўзросту, з дзіцячага садка, прывіваць любоў да сваёй краіны, да сваёй малой радзімы, да таго горада, раёна, дзе ты жывеш».

Ад Савета Рэспублікі спікер верхняй палаты парламента перадала дашкольнай установе сертыфікат на 10 тысяч рублёў.

Паводле БелТА.

З навалай спраўляемся разам

Учора ў сталічным парку Дружбы народаў, каля памятных знакаў «Ахвярам Чарнобыля» і «Камень міру Хірасімы» прайшоў памятны мітынг, прысвечаны 37-й гадавіне з дня чарнобыльскай трагедыі.

Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар ЛУЦКІ, выступаючы на мітынгу, падкрэсліў, што пасля развалу Савецкага Саюза Рэспубліка Беларусь узяла на сябе ўвесь цяжар аднаўлення зямель. Амаль 25 працэнтаў тэрыторыі нашай краіны было пакрыта радыяцыяй, і праводзіць там якія-небудзь віды работ і пражываць пасля катастрофы на ЧАЭС стала немагчыма. Ігар Луцкі заўважыў, што беларуская дзяржава ўклала каласальныя сродкі, рэалізавала некалькі дзяржпраграм, накіраваных на аднаўленне пацярпелых зямель.

«Мы з гонарам справіліся з гэтым толькі дзякуючы таму, што ўся краіна як адзіны механізм, як адзінае цэлае ўключылася ў працэс ліквідацыі наступстваў аварыі. І дагэтуль уся краіна працуе над ліквідацыяй гэтых наступстваў. Забруджаны нашы лясныя ўгоддзі, палі. Гэтыя тэрыторыі на пастаянным кантролі Прэзідэнта. Напярэдзе яшчэ даволі шмат работы. Мінула 37 гадоў, і па некаторых радыяцыйных элементах толькі-толькі скончыўся перыяд паўраспаду. Да працэсу павінны падключыцца вучоныя, каб вызначыць, якія віды раслін можна вырошчваць. Яшчэ раз падкрэсліў, што толькі дзякуючы сумесным намаганням можна справіцца з гэтай трагедыяй», — акцэнтаваў увагу Ігар Луцкі.

Ён правёў паралелі з сённяшняй сітуацыяй ва Украіне, куды пастаўляюцца боепрыпасы з абедненым уранам. «Мы добра разумеем, што такое радыяцыйнае забруджванне. У той жа час мы бачым, што адбываецца ва Украіне. Людзі не разумеюць, што яны робяць. Яны падрываюць здароўе людзей і эканоміку, проста развальваюць краіну. Таму сёння, збіраючыся на гэты мітынг, смуткуючы па тых, хто абараніў Еўропу ад радыяцыйнай пагрозы, мы нагадваем усім, што рабіць тое, што робіцца цяпер, нельга», — рэзюмаваў Ігар Луцкі.

❍ Даслоўна

Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА,
Старшыня Палаты прадстаўнікоў:

«26 красавіка — знакавая дата нашай гісторыі. 37 гадоў таму чарнобыльская аварыя горам адгукнулася ў сэрцах беларусаў. Наступствы тых падзей вялікім цяжарам ляглі на плечы маладой беларускай дзяржавы, запатрабавалі кансалідацыі ўсіх наяўных сіл для аднаўлення страт, нанесеных краіне, вызначылі далікатнае стаўленне грамадства да пытанняў экалагічнай бяспекі. Многія задачы вырашаліся ўпершыню, а галоўнай каштоўнасцю заўсёды заставаліся людзі. Мы паслядоўна лячылі раны зямлі і пераадольвалі наступствы тэхнагеннай трагедыі.

Знайшліся і тыя, хто спрабаваў палітызаваць гэтую падзею, выкарыстоўваць як падставу для самапіяру і дэстабілізацыі абстаноўкі ў грамадстве. Але беларусы хутка разабраліся, хто ёсць хто, і падтрымалі Прэзідэнта, для якога чарнобыльская праблема заўсёды з'яўлялася рэальным прыярытэтам».

СПОРТ НЕ СПЫНІЎСЯ І ПРАЦЯГВАЕ ЖЫЦЬ

Нацыянальны форум атлетаў прайшоў у Мінску

У штаб-кватэры НАК Беларусі стартаваў Нацыянальны форум атлетаў. Мерапрыемства праходзіць ужо трэці раз і нязменна аб'ядноўвае функцыянераў, экспертаў, трэнераў, знакамітых чэмпіёнаў і маладых атлетаў. Спартыўнай супольнасці ёсць што абмеркаваць — арганізацыю спаборніцтваў і вучэбна-трэніровачных збораў, пошук новых магчымасцяў для развіцця галіны. Ва ўмовах адхілення ад міжнародных стартаў выстаяць і плённа развівацца спорту Беларусі і Расіі дапамагае эфектыўнае супрацоўніцтва. Як яно наладжана і як выбудоўваецца дыялог з міжнароднымі спартыўнымі арганізацыямі, журналістам расказалі Прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта Рэспублікі Беларусь Віктар Лукашэнка і прэзідэнт Алімпійскага камітэта Расіі Станіслаў Пазнякоў. Сабралі для чытачоў галоўнае.

Кіраўнік НАК Беларусі падкрэсліў, што за мінулы год беларускімі і расійскімі алімпійскімі камітэтамі, міністэрствамі спорту праведзена вялікая работа па арганізацыі сумесных турніраў і збораў. Усяго краіны разам правялі больш за 100 мерапрыемстваў. «Калі вярнуцца на год таму, калі мы пачыналі гэтую работу, было шмат здзіўлення, калі ў пратаколах расійскіх спаборніцтваў бачылі імёны беларускіх атлетаў. Цяпер гэта абсалютная норма, ніхто не дзівіцца», — заўважыў Станіслаў Пазнякоў. Самым значным сумесным праектам ён назваў удзел беларускай каманды ў Міжнародных спартыўных гульнях «Дзеці Азіі» ў Кемераве, адкуль беларусы прывезлі 11 медалёў. Па словах кіраўніка АКР, гэта быў прарыў і ў спартыўным, і ў маральным плане. «Найвышэйшая праява алімпійскай салідарнасці была прадэманстравана на гэтым турніры. Я ўпэўнены, што ў нас напярэдзе наступныя праекты, летнія «Дзеці Азіі» не за гарамі. Мы яшчэ будзем абмяркоўваць наш удзел. Цяпер мы канцэнтруемся на двухбаковых сувязях, будзем іх развіваць у інтарэсах беларускага і расійскага бакоў», — адзначыў ён.

Сёння востра стаіць пытанне дзяржаўнай сімволікі — ці прымальна беларусам і расіянам выступаць пад нейтральным сцягам, калі гэта стане ўмовай допуску на міжнародныя старты, у тым ліку на Алімпійскія гульні. Віктар Лукашэнка звярнуў увагу, што пытанне не толькі ў сімволіцы — месяц таму Міжнародны алімпійскі камітэт прадставіў шэраг іншых умоў, пры выкананні якіх беларусы і расіяне могуць выступаць на міжнароднай арэне. Напрыклад, яны могуць выступаць толькі індывідуальна пад нейтральным сцягам, выступленні камандаў з Беларусі і Расіі забароненыя. Таксама, згодна з умовамі МАК, не дапускаюцца да спаборніцтваў спартсмены, якія значацца ў арміі або сілавых структурах.

«Тут, на мой погляд, павінна быць пэўная чырвоная рыса, праз якую мы не можам пераступіць. Толькі з павагай да нашай краіны, з павагай да нашых спартсменаў мы можам браць удзел у гэтых спаборніцтвах. Мы не кідаемся ў вір галавою, толькі дапусціце. Ёсць моманты, якія мы ніколі не пераступім, ёсць прынцыпы, якіх мы будзем прытрымлівацца», — заявіў Віктар Лукашэнка.

Станіслаў Пазнякоў назваў умовы МАК фарсам: «Міжнародны алімпійскі камітэт пайшоў насустрач, пачуў крытыку з боку Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, крытыку з боку Савета па правах чалавека, якія крытыкавалі забарону на ўдзел у спаборніцтвах беларускіх і расійскіх спартсменаў толькі на падставе іх пашпарта. Але тыя ўмовы не былі знятыя і дагэтуль. Сёння да дыскрымінацыі па нацыянальнай прыкмеце дадалася дыскрымінацыя па родзе дзейнасці, па прыналежнасці да спартыўных арганізацый». Па яго словах, гэта несправядлівыя і юрыдычна нікчэмныя ўмовы, паколькі яны не прапісаныя ў Алімпійскай хартыі.

Віктар Лукашэнка ўпэўнены, што нават у такіх складаных умовах трэба весці дыялог з міжнароднымі спартыўнымі федэрацыямі і арганізацыямі. Тым больш што, па яго словах, нефармальныя адносіны з міжнароднымі структурамі нядрэнныя, але, на жаль, на афіцыйным узроўні яны рэзка мяняюцца.

Нягледзячы на ўсе складанасці, развіццё спорту вышэйшых дасягненняў застаецца першачарговай задачай алімпійскіх камітэтаў Беларусі і Расіі. Віктар Лукашэнка звярнуў увагу, што ў жніўні Беларусь прыме II Гульні краін СНД, якія прадэманструюць, што спорт не спыніўся і працягвае жыць.

Валерыя СЦЯЦКО.

У ЮБІЛЕЙНЫ ГОД — НА ДОШЦЫ ГОНАРУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Паколькі раён у значнай ступені сельскагаспадарчы, як забяспечваецца харчовая бяспека?

— У Дзятлаўскім раёне шэсць сельскагаспадарчых арганізацый і 14 фермерскіх гаспадарак. У галіне занятыя 18 тысяч чалавек. Можна сказаць, што па ўсіх напрамках сельгасвытворчасці ў 2022 годзе адбыўся даволі высокі рост у параўнанні з папярэднім годам. Асабліва парадавалі такія культуры, як рапс, лён, цукровыя буракі і агародніна. З прыбыткам спрацавала жывёлагадоўля. На карову ў сярэднім за год атрымана 5,6 тысячы кілаграмаў малака, прырост склаў амаль 830 кілаграмаў. Усе сельгаспрадпрыемствы выканалі планы паставак прадукцыі на перапрацоўку.

Старшыня райвыканкама Андрэй САДОЎСКІ.

«Дзятлаўшчына можа ганарыцца сваімі дасягненнямі. Але мы разумеем, што цяпер важна не толькі ўтрымаць пазіцыі, але і палепшыць развіццё раёна па ўсіх напрамках, значны акцэнт будзе зроблены на прамысловасці і сельскай гаспадарцы».

— Ці ёсць перспектывы па інвестпраектах? Як вядома, такія праекты павінны ажыццяўляцца ў кожным раёне.

— Дзякуючы інвестыцыям раён развіваецца. Назіраецца тэндэнцыя да павелічэння тэмпаў росту па прыцягванні інвестыцый. Гэта дае магчымасць набываць новую тэхніку, сучаснае абсталяванне, ствараць новыя працоўныя месцы, павялічваць заработную плату. Значным праектам можна назваць прадпрыемства па выпуску перадызаляваных і водаправодных труб. Тэрмін рэалізацыі — 2020—2025 гады. Прадпрыемства выпускае імпартазамяшчальную прадукцыю, што дапамагае супрацьстаяць санкцыйнаму ціску. Таксама нашы прадпрыемствы займаюцца мадэрнізацыяй кацельных установак, каб павысіць эфектыўнасць вытворчасці прадукцыі.

— Ведаю, што раён шукае магчымасць развівацца ў турыстычным напрамку. Чым цікавая Дзятлаўшчына для турыстаў?

— Брэндавым святам раёна стаў «Зэцэльскі фэст» — фестываль сямейнага конкурсу і адпачынку. Фестываль пакуль малады, але яго папулярнасць расце. Разам з тым наш край багаты сваёй гісторыяй, нам ёсць што паказаць і чым здзівіць гасцей. Усяго ў склад 15 распрацаваных турыстычных маршрутаў увахо-дзіць 55 аб'ектаў.

Дзякуючы санаторыям «Радон» і «Альфа Радон», актыўна развіваецца аздараўленчы турызм. Варта адзначыць, што па аб'ёме экспарту турыстычных паслуг усёй Гродзенскай вобласці наш раён займае 70 працэнтаў.

Таксама карыстаюцца папулярнасцю сплавы на байдарках. У дадзеным кірунку дзейнічаюць водныя маршруты: «Па хвалях Моўчадзі», «Шчара — рака партызанская», «Прынёманскія краявіды». Ёсць цікавы камбінаваны водна-пешы тур з элементамі анімацыі «Ад цара да самавара». Мы працуем над стварэннем сваёй турыстычнай мадэлі з выкарыстаннем мясцовых рэсурсаў. Іх нямала. Гэта і цікавыя гістарычныя мясціны, ландшафты, культурныя традыцыі, рэдкая флора — наведванне такіх лакацый будзе суправаджацца рознымі відамі транспарту, у тым ліку камбінаваным. Летась у Нацыянальным агенцтве па турызме быў атэставаны наш новы маршрут «Дарогамі Дзятлаўшчыны». Сюды ўвайшлі аб'екты, якія паасобку вядомыя турыстам, але мы вырашылі іх аб'яднаць у адзіную сетку. Гэта паклонныя валуны, археалагічнае гарадзішча «Талерка», анёл з Неапаля, сабор, які будаваўся сто гадоў, адзін з элементаў дугі Струвэ і многае іншае.

Летась мы ўрачыста адкрылі турыстычны маршрут «Партызанскай сцежкай па Ліпічанскай пушчы». Цяпер займаемся распрацоўкай новага гісторыка-пазнавальнага турыстычнага маршруту «На ўскрайку Ліпічанскай пушчы, альбо Накрышская гісторыя». Ёсць ідэя стварыць турыстычны кластар «Легендамі сівой даўніны: род Стравінскіх». Калісьці род валодаў гэтымі мясцінамі.

Бачым перспектыву ў развіцці гастранамічнага турызму. У такую работу ўключылася даволі шырокае кола грамадскасці. Напрыклад, школьнікі займаюцца вывучэннем страў сваіх продкаў, музей бярэ на сябе рэалізацыю міні-праекта «Жыццё продкаў праз адкрыццё свету беларускай кухні». Вынікам такой сумеснай работы павінен стаць выпуск «Кулінарнай энцыклапедыі Дзятлаўшчыны».

— Летась вам удалося знайсці гаспадара для старажытнага будынка, помніка архітэктуры XVIII стагоддзя, былога палаца Радзівілаў. Аб'ект у далейшым будзе неяк звязаны з турыстычнай сферай?

— Так. Сапраўды, летась аб'ект выкупіў расійскі бізнесмен. Будынак патрабуе значных укладанняў, таму кошт продажу быў мінімальны — усяго тры базавыя велічыні. Што канкрэтна мяркуе размясціць у старажытным будынку новы ўласнік, дакладна невядома. Ёсць меркаванне, што там можа з'явіцца аб'ект сацыяльнай накіраванасці, які будзе даступны ў тым ліку для турыстаў.

Цяпер у графік па ўцягванні ў гаспадарчы абарот уключана дзевяць аб'ектаў. Большая частка з іх будзе прапанавана за адну базавую велічыню. Найбольш прывабным для пакупнікоў можна назваць комплекс былой турыстычнай базы.

— Што цікавага чакае жыхароў і гасцей горада падчас святкавання 525-годдзя Дзятлава? Калі адбудзецца свята?

— Мяркуем, што будзем святкаваць летам, цяпер удакладняем дату. Але праграма ўжо распрацавана. Прадпрыемствы і ўстановы рыхтуюць падарункі гораду ў выглядзе архітэктурных формаў і памятных знакаў. Адбудзецца фестываль талентаў. Будзе шырокая забаўляльная праграма з кулінарным фэстам, майстар-класамі, жывымі скульптурамі розных эпох і многім іншым.

Вядома, вядуцца работы па добраўпарадкаванні тэрыторый, навядзенні парадку. Спадзяюся, што да гэтага падключацца нашы прадпрыемствы, установы і жыхары горада. Мяркуем упрыгожыць вуліцы інсталяцыямі і кветнікамі.

— Мінулы год прынёс Дзятлаўскаму раёну заслужаную славу. У ліку 64 пераможцаў спаборніцтва раён будзе занесены на рэспубліканскую Дошку гонару. Якія планы на сёлетні год?

— Сапраўды, Дзятлаўшчына можа ганарыцца сваімі дасягненнямі. Але мы разумеем, што цяпер важна не толькі ўтрымаць пазіцыі, але і палепшыць развіццё раёна па ўсіх напрамках, значны акцэнт будзе зроблены на прамысловасці і сельскай гаспадарцы. Напрыклад, сёлета мяркуецца пашырэнне вытворчасці пластыкавых труб. Будзе арганізавана вытворчасць па дрэваапрацоўцы, адноўлена вытворчасць рафінаваных тлушчаў і маслаў з рапсу. Некаторыя з гэтых вытворчасцяў размесцяцца ў гарадскім пасёлку Наваельня. Гэты населены пункт мы плануем развіваць і ў сацыяльным плане. Будуць выдзелены сродкі на рамонт школы, добраўпарадкаванне вуліц. Да 1 Мая завершым рамонт раённай бальніцы. Сёлета плануем увесці ў эксплуатацыю тры новыя малочнатаварныя комплексы.

Маргарыта УШКЕВІЧ.
Фота з адкрытых крыніц.

Па сутнасці

Шлях да адраджэння

Зараз Велікодныя дні зноў дораць нам надзею. Але чаму толькі надзею? Упэўненасць! Жыцця пасля смерці. Памятаеце, як казаў апостал Фама-Блізнюк: «Пакуль не ўбачу, не паверу». І яшчэ вядомае выказванне — аж да мурашак па спіне: «Гасподзь мой і Бог мой!»

Пабачыць жыццё пасля смерці — у зямным плане — адраджэнне пасля забыцця можна і на Беларусі. Успамінаю тыя падзеі амаль саракагадовай даўнасці: бяду, роспач, горыч, катастрофу саюзнага маштабу. Разгубленасць...

Чарговая навала да нашых людзей і на нашу зямлю прыйшла, як нацыская акупацыя, сярод ночы. Акупацыя — радыяцыяй. Выбух на чацвёртым рэактары. На тэрыторыі паўднёвай суседкі. Не першы раз атрымліваем ад іх выпрабаванні. Вось і хату сваю падпалілі. А пра крывавыя сляды хатынскай трагедыі мы ўвогуле доўга маўчалі. На жаль. А цяпер пагадзіцца з тым, што каты і гвалтаўнікі беларускага народа ёсць куміры для сучаснай Украіны — не. Ніколі — не. Мільёны разоў — не.

Я пра тое, што, як казаў Колас вуснамі дзеда Талаша: — «не мы тое пачыналі, але нам гэта заканчваць». Мы ніколі не ствараем праблем для іншых, але мы заўжды іх вырашаем. А колькі гэта каштуе нам, беларусам, хтосьці спытаў? Я не пра грошы. Пра людзей. А пра грошы і гаворкі няма. Як тут свае букінгемы пабудуеш? Чарнобыль быў савецкім. Карысталіся ўсе. А вось з бядой Беларусь засталася сам-насам. Абяцалі шмат. Той страшэнны выбух нават параўноўваюць з геапалітычнай катастрофай — развалам Савецкага Саюза. А Беларусь выстаяла. Трэба гэта памятаць. Трэба аб гэтым казаць. На ўвесь свет. Але мы не гарлапаны. Мы — нацыя працаўнікоў. Праўда, гарлапанаў у нас таксама, як і раней, хапае.

Рупар у рукі, на ганак любога будынка і заклік — «пайшлі да дэмакратыі». І на могілкі. Называлася тое «чарнобыльскім шляхам». Самыя актыўныя сабе на галовы чаплялі папяровыя стужкі са знакам радыяцыі. Звычайна такія стужкі, але з малітвай, на галаву кладуць нябожчыкам. Так, пасля Чарнобыля нас ужо пахавалі. Нашу краіну і народ. Паводле прагнозу, да 2000 года мы павінны былі сысці на пагост. «Чарнобыльскім шляхам» — на Курапаты.

Увогуле гэта не стасуецца з сапраўднай беларускасцю. Але тыя, хто самачынна каранаваў сябе «самымі правільнымі і шчырымі беларусамі» — цяпер «неверагоднымі» — яны плююць на сапраўдную беларускасць — на нашу людскасць. Бо выконваць палітычную партыю, ператвараючы могілкі ў інструмент, — ганебна. Ганьба — варта гэтак заляпіць на ўсю сілу баса ў еўрапейскія твары заходняй палітыкі і збеглым ворагам нашай дзяржаўнасці.

Яны зноў і зноў ладзяць танцы на нашым балючым. Як той казаў, на касцях. А што яшчэ чакаць ад цывілізацыі хэлаўіна? Нават талерантную назву сабе выдумалі — фрыкі. Тым фрыкам, мабыць, у іх інфернальных перформансах накont чарнобыльскай трагедыі не хапае дэфіле мужчын на абцасах ды сцягоў з усімі адценнямі «новых нармальнасцяў». Але і без таго растапталі ўсё.

Кажуць, у 1986-м, напярэдадні трагедыі, атэісты Прыпяці зладзілі «хрэсны ход» — дулю нябёсам паказалі. Дапаказваюцца і гэтыя адэпты новай рэлігіі. Хоць метады ўсё тыя ж. Гарлапанскія. Крычаць так, каб пачулі спонсары. Калі тыя спонсары, як Байдэн, — доўга крычаць спатрэбіцца.

З людской роспачы шмат палітычных капіталаў жадалі сабраць. А ці былі тыя завадатары «чарнобыльскіх маршаў» хоць бы аднойчы ў чарнобыльскіх рэгіёнах? Памятаю фільм «Рэйнджар з атамнай зоны» (у той час пачыналася хвароба на англіцызмы). Дык там стары заплакаў, бо яго руку паціснуў галоўны герой. Упэўнены, дэмакраты «бэчэбэшнага» кшталту не тое што руку дапамогі, нават проста руку баяліся працягнуць пацярпелым людзям. А калі і ехалі, дык не далей Мазыра, ды і тое толькі са сталічнымі харчамі.

А цяпер згадайце, хто першы з палітыкаў з галавой акунуўся ў забрудненыя Прыпяцкі край? Колькі тых імгненняў надзеі — Лукашэнка падарыў яе. І стрымаў сваё слова. Адна з фатаграфій, што ўмяшчае ўсю веліч натуры беларускага лідара, — у атачэнні людзей-працаўнікоў. Тут жа іх прылады працы. Зроблена ў так званай чарнобыльскай зоне. Больш ні ў кога з прэзідэнтаў такой фатаграфіі, бадай, няма. А тое быў толькі пачатак. Тады і дамовіліся: будзем адраджаць гэтыя землі. Як адрадзіліся пасля нацыскай навалы, так адрадзіліся і пасля чарнобыльскай трагедыі.

Бяда тая адрэзала самы добры кавалак зямлі нашай беларускай. Землі там — урадлівыя, прырода — райская. А песні якія харошыя! Аўтэнтычная культура жыве. І песні гучаць. Не жальбы. А жыцця. Гуканне вясны — напрыклад — кліч аднаўлення.

Але пісаць пра тое лёгка, а вось усё гэта ўзнімаць з руін, а галоўнае — людзей вырываць з палону роспачы і страху было цяжка. Але пабудавалі той шлях. Я некалькі разоў быў у чарнобыльскіх рэгіёнах. І з тога боку — каля чацвёртага энергаблока, і ў кожным з нашых пацярпелых раёнаў. Там здымалі фільмы-тэлеапавяданні пра культуру і гісторыю, пра мінулае. А пасля ўжо — падчас паездак з Прэзідэнтам. Як павялося, штогод кіраўнік дзяржавы накіроўваецца ў шматпакутныя рэгіёны, каб пагутарыць з людзьмі, на месцы вырашыць, чаму дзяржаве ўдзяліць увагу, атрымаць справаздачу аб выкананых даручэннях.

І кожны раз бачу я, як ажываюць тыя мясціны. Сказаць: рэсурсаў пайшло шмат — нічога не сказаць. Як тут свае букінгемы пабудуеш? То вайна, то Чарнобыль.... Кажуць, чорныя буслы на Беларусі з'явіліся ад таго, што белыя бацяны сваімі крыламі схавалі нашых дзяцей ад чарнобыльскага попелу. Вядома, гэта легенда. А насамрэч так — ёсць людзі, якія бароняць нашу краіну ад усякай навалы. Гэта стала нашым болем, гісторыяй, нават асаблівасцю. Спачатку — балючай ранай. З часам — сімвалам цярпення і шляху да перамогі. У яшчэ адной вайне. За магчымасць застацца ў гісторыі і людзьмі звацца — беларусамі.

Можна, вядома, ператварыць гэтыя землі ў страшыдла для свету. Але гэта не па-беларуску, не па-бацькоўску. Як гэта — разарваць пупавіну з зямлёй? Не. Мільёны разоў — не. І зноў тчэ рука новы ўзор жыцця на неглюбскай посцілцы. Уплятае вывы жывой Беларусі. Гэта як адраджэнне пасля забыцця — аж да мурашак па спіне.

Яўген ПУСТАВОЙ.

СЯЎБА Ў «ВАЗНЯСЕНСКУ»...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— У нас у вёсцы ёсць прыказка: калі не заробіш у майцы, то не заробіш і ў фуфайцы, — на пытанне «Наколькі цяпер напружаны тэмп работы?» адказвае **механізатар ААТ «Вазнясенск» Дзмітрый КУЦАПАЛАЎ.** — Змена цяпер — з сямі раніцы і да сямі вечара. Перад выхадам — абавязковае тэхнічнае абслугоўванне трактара і сеялкі. Наогул яшчэ і загадзя, да пачатку сяўбы падрыхтавалі машыны і агрэгаты, перабралі ўсе падшыпнікі, «зорачкі».

Перад выхадам сеялкі праводзяць перадпасяўную апрацоўку глебы. На вачах абуджаецца рытм і рух вясковага жыцця.

— Спачатку праходзіць трактар, які ўносіць азот, пасля культыватар «закрывае» ўгнаенне ў глебе, ужо пасля я магу сеяць, — тлумачыць Дзмітрый Куцапалаў.

За рулём трактара на пасяўной ён толькі другі сезон. Да гэтага ў роднай гаспадарцы шмат гадоў працаваў слесарам па рамонце тэхнікі.

— Безумоўна, такі досвед — вялікі плюс для механізатара. Калі працуеш у полі і нешта ламаецца, вельмі хутка арыентуешся, які рамонт патрэбен, што можна зрабіць аператыўна ў полі, а што не, — дадае Дзмітрый.

Высвятляецца, што ў кабіне трактара ён — колькі сябе помніць.

— Яшчэ да педаляў не даставаў, калі бацька браў мяне з сабой у кабіну, даваў патрымацца за руль, — прызнаецца малады механізатар.

Бацька Дзмітрыя — Пётр Куцапалаў — усё жыццё адпрацаваў у родным «Вазнясенску» трактарыстам. Сёння ўжо яго ўнук-старшакласнік, сын Дзмітрыя, на лета ўладкоўваецца на зярняток у гаспадарцы.

— Усе ўмовы ёсць, толькі працуй. Мне вельмі спадабалася працаваць механізатарам. Падчас уборачнай пераходжу на прэс, — дадае суразмоўнік.

СЕЛЬГАСНАВІНКІ І «БЯЛКОВЫ» ІНТАРЭС

Царыца палёў — кукуруза — у гаспадарцы сёлета будзе пасеяна на адной тысячы гектараў: 300 гектараў — на зерне, астатняя плошча — на зялёную масу. Па лічбах уводзяць у курс справы **дырэктар ААТ «Вазнясенск» Арцём ЯРМАК і галоўны аграном гаспадаркі Генадзь КУДРАВЕЦ.**

— Да гаспадаркі далучылі свінакомплекс, таму каб забяспечыць прадпрыемства неабходным зернем кукурузы, плошчы пад яе павялічылі на 200 гектараў, — тлумачыць Арцём Ярмак. — Надвор'е спрыяе, у нас палі не перавільготненыя, таму мы ў тэрмін скончылі сяўбу ранніх яравых збожжавых. У нас пад іх адведзена 300 гектараў.

Механізатар ААТ «Вазнясенск» Чачэрскага раёна Дзмітрый КУЦАПАЛАЎ і галоўны аграном гаспадаркі Генадзь КУДРАВЕЦ загружаюць насенне кукурузы ў сеялку.

Чакаюць добрага ўраджаю і ад новай для гаспадаркі культуры — соі. Летась упершыню сеялі сланечнік, які вельмі добрае сябе паказаў на тутэйшых землях.

— Сёння мы імкнёмся максімальна забяспечыць сябе бялковай сыравінай — рапсам, сланечнікам, сояй. Летась ураджай сланечніку перапрацавалі на Гомельскім тлушчавым камбінаце. Алей рэалізавалі на вельмі выгадных для нас умовах, таму што на сёння на біржы цэны на яго ўжо значна ніжэйшыя. Макуху пакінулі для ўласнай жывёлагадоўлі, для забеспячэння гаспадаркі бялковай сыравінай, як і было запланавана. Цяпер ужо можам ацаніць, што будзе нядрэнны ўраджай новай для нас культуры — соі: 250 гектараў сеялі пад зіму, 28 гектараў, якія не перазімавалі, перасяваем сланечнікам і яшчэ дадаём 50 гектараў соі, — падзяліўся кіраўнік гаспадаркі.

НА КАРЫСЦЬ БУДУЧАГА ЎРАДЖАЮ

Вопыт правядзення пасяўной кампаніі на прыкладзе работы аграрыяў ААТ «Вазнясенск» ацанілі ўдзельнікі абласнога выязнога семінара, які прайшоў на базе Чачэрскага раёна. Прадстаўнікі ўсіх раёнаў рэгіёна прааналізавалі вынікі работы жывёлагадоўлі за першы квартал бягучага года.

На неабходнасць строгага захоўваць тэхналогіі і максімальна выкарыстоўваць кожны пасяўны ўчастак падчас мерапрыемства звярнуў увагу **першы намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Дзмітрый ПЕТРАЖЫЦКІ.**

— Летась, пасля ўборкі каласавых культур, гаспадаркі рэгіёна пры падтрымцы навукоўцаў інстытута земляробства Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі перагледзелі нашу структуру пасяўных плошчаў з улікам памяншэння аб'ёмаў пасеваў кукурузы. На 40 тысяч гектараў мы сёлета зменшылі пасевы кукурузы на сілас, пры гэтым павялічваем сяўбу траў для атрымання бялковых кармоў і павялічваем сяўбу кукурузы на зерне. Калі летась убіралі 25 тысяч гектараў кукурузы на зерне, то сёлета запланавалі пасеяць 75 тысяч гектараў, — звярнуў увагу Дзмітрый Петражыцкі.

Сяўбу кукурузы гаспадаркі рэгіёна павінны завяршыць да 20 мая. Між тым аграрыі Брагінскага і Мазырскага раёнаў Гомельшчыны завяршылі сяўбу ранніх яравых збожжавых. Блізкія да завяршэння кампаніі — Гомельскі, Акцябрскі, Хойніцкі раёны, дзе засеяна больш за 98 працэнтаў ад запланаваных плошчаў. Акрамя таго, ва ўсіх раёнах вобласці пачалася сяўба кукурузы. Пасеяна звыш 20 тысяч гектараў гэтай культуры. Сярэднеабласны паказчык па сяўбе кукурузы перасягаюць Мазырскі, Нараўлянскі, Петрыкаўскі і Чачэрскі раёны.

Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.

Падпіска-2023

Са «Звяздой» сапраўды спадручней

Цяпер такія тэчкі — грунтоўныя, кардонныя, з дзвюма стужкамі-завязкамі і вялікім надпісам «ДЕЛО» — амаль што не ўбачыш: гэта раней яны многім служылі... І «звяздоўцам» — таксама, адзін з якіх аднойчы ўдала пажартаваў: перад словам «ДЕЛО» дапісаў... «Знайшлі».

У кожным жарце і сапраўды кропля жарту, — усё астатняе праўда. То-бок справа, якую робяць газетчыкі, ім жа часам здаецца не вельмі сур'ёзнай: гэта не хворых лячыць, не хлеб пячы, не дамы будаваць...

Але ж існуе зваротная сувязь: здараюцца сустрэчы з чытачамі, прыходзяць пісьмы-падзякі — за вернасць мове і канкрэтную дапамогу, за інфарматыўнасць і аператыўнасць, за шчыры народны гумар, за своечасовыя парады і рэцэпты, за прызы.

Днямі адбыўся чарговы розыгрыш.

Прас Holt-HT-IF-010 выйгралі:

Шчэрба Аляксей Васілевіч, г. Кобрын Брэсцкай вобласці;

Грамыка Раіса Фёдараўна, в. Вялікі Поўсвіж Віцебскай вобласці;

Крацік Алена Уладзіміраўна, г. Гомель;

Іголка Мікалай Іванавіч, г. п. Зэльва Гродзенскай вобласці;

Лойка Вера Аляксандраўна, г. Дзяржынск Мінскай вобласці;

Гаўрыш Валерый Мікалаевіч, г. Чавусы Магілёўскай вобласці;

Сідарэвіч Людміла Яўгенаўна, г. Мінск.

СУПЕРПРЫЗ — вертыкальны пыласос Deerma DX700S — выйграў

Барбашынскі Браніслаў Іванавіч, г. Валожын Мінскай вобласці.

Шчыра віншуем тых, каму пашчасціла! Калі ж не (пакуль што), — калі ласка, не засмучайцеся! Не за гарамі новая падпісная кампанія, падчас якой на старым прывычным месцы (у пятнічных нумарах, на першай старонцы тэлепраграм) зноў будуць друкавацца знаёмыя купоны. І вы, афармляшы падпіску, не забудзеце іх запоўніць, выразаць і дасласць у рэдакцыю. А там... Удача — яна такая: сёння ўсміхаецца некаму іншаму, заўтра — магчыма, вам. Ну чаму б і не?!

Афіцыйна

Арганізатарам рэкламнай гульні «Са «Звяздой» спадручней» з'яўляецца рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (УНП 100155376), размешчаная па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Рэкламная гульня «Са «Звяздой» спадручней» зарэгістравана Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь 15.02.2023 г. (пасведчанне № 4288) і праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь з 1 сакавіка 2023 па 30 чэрвеня 2023 года ўключна сярод падпісчыкаў газеты «Звязда» на першы квартал або першае паўгоддзе 2023 года. Усяго ў гульні ўзялі ўдзел 74 падпісчыкі. Прызавы фонд гульні разыграны цалкам.

Тэлефон для даведак па пытаннях правядзення рэкламнай гульні і атрымання прызоў 8 (017) 271 81 53.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

З-за масавых звальненняў у Польшчы можа спыніцца адзіны ядзерны рэактар

У Польшчы можа спыніцца адзіны ядзерны рэактар »Марыя». Пра гэта паведаміла агенцтва РІА «Навіны», спасылаючыся на радыёстанцыю RMF FM.

Прычынай масавых звальненняў супрацоўнікаў з'яўляецца нізкая зарплата. Работнікі заяўляюць, што прапановы аб іншай рабоце ўжо паступаюць і аплата працы там значна перавышае цяперашнюю. У сувязі з гэтым выказваюцца апасенні, нібыта масавыя звальненні прывядуць да спынення работы рэактара «Марыя», што раптоўна прывядзе да недахопу радыеізатопаў. Таму пацыенты застануцца без неабходнага лячэння і дыягностыкі захворванняў касцей, сэрца, работы крывяноснай сістэмы і ракавых захворванняў. Пры гэтым падкрэсліваецца, што набрацъ у штат у найкарацейшыя тэрміны новых работнікаў не выпадае ў сувязі з важнасцю наяўнасці двух-, а часцей за ўсё трохгадовага досведу работы. Як вядома, рэактар «Марыя» быў запушчаны ў эксплуатацыю ў 1974 годзе. Цяпер ён застаецца адзіным пастаўшчыком прадукцыі некалькі дзясяткам польскіх медыцынскіх устаноў. Раней у Польшчы працаваў яшчэ адзін такі ядзерны рэактар — «Эва», але ён быў выведзены з эксплуатацыі ў 1995 годзе.

Падчас выбуху ў паліцэйскім участку ў Пакістане загінулі 18 чалавек

Пры выбуху ў паліцэйскім участку на паўночным захадзе Пакістана загінулі 18 чалавек, яшчэ 50 параненыя. Аб гэтым паведаміла ТАСС са спасылкай на мясцовыя СМІ. Адбыўся ўзброены напад экстрэмістаў. Спачатку ў паліцэйскім участку дэпартамента па барацьбе з тэрарызмам у раёне Кабал пачалася перастрэлка, далей тэрарыст-смяротнік прывёў у дзеянне выбуховае прыстасаванне, пасля якога адбылася дэтанацыя боепрыпасаў, якія захоўваліся ў будынку. У выніку тэракта загінулі 18 чалавек, у ліку якіх 11 паліцэйскіх, пяць затрыманых і двое цывільных. Ударнай хваляй пашкоджаны дамы побач з месцам здарэння, радыус зоны паражэння склаў два кіламетры. Ратавальнікі вядуць пошук людзей, якія трапілі пад завалы.

Іспанія папрасіла ў Еўракамісіі сродкі з надзвычайнага фонду з-за рэкордной засухі

Іспанскія ўлады звярнуліся да Еўрапейскай камісіі з просьбай аказаць фінансавую дапамогу краіне на фоне рэкордной засухі. Аб гэтым паведаміла ТАСС са спасылкай на іспанскае выданне El Pais. У лісце кіраўніка Мінсельгаса Іспаніі Луіса Планаса, адрасаваным камісару ЕС па пытаннях сельскай гаспадаркі Янушу Вайцэхоўскаму, адзначаецца, што з-за гарачага засушлівага надвор'я сельскагаспадарчы сектар краіны нясе сур'ёзныя страты. Іспанія не можа справіцца з сітуацыяй самастойна, у сувязі з чым Мадрыд просіць Еўракамісію выдзеліць сродкі для аказання дапамогі з надзвычайнага сельскагаспадарчага рэзерву ЕС. У Іспаніі сёлетні красавік стаў самым засушлівым за больш як 60 гадоў. Сіноптыкі прагназуюць, што спёка будзе ўзмацняцца. У найбліжэйшыя дні чакаецца да 40 градусаў цяпла, што з'яўляецца рэкордным паказчыкам для гэтай пары года.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
27 КРАСАВІКА 2023 г.
ЧАЦВЕР
№ 8 (15952)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

Лізавета МУСОРЫНА:

«Кожнай выканаўцы трэба знайсці сваю Жызель»



Першы сезон у Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры Беларусі ў маладой артысткі балета Лізаветы Мусорынай выдаўся насычаным. Мінулым летам дзяўчына скончыла Мінскую харэаграфічную гімназію-каледж і была залічана ў трупу тэатра. Але тыя, хто цікавіцца балетам, ведаюць: каб юная артыстка здолела правесці на сцэне ўвесь спектакль у сольнай партыі, даводзіцца гадамі адточваць тэхніку, танцаваць у кардэбалеце. Але здарылася рэдкая сітуацыя: першая прэм'ера з Лізаветай у галоўнай партыі адбылася ўжо праз некалькі месяцаў работы ў тэатры...

— Шмат для каго ваша прызначэнне на ролю Жызель было нечаканасцю...

— Гэта было нечаканасцю і для мяне. Бо я толькі скончыла школу. Да нас на ўрок прыходзіў Ігар Паўлавіч Колб (пастаноўшчык спектакля і галоўны балетмайстар Вялікага тэатра Беларусі). Яны з маім педагогам Вольгай Аляксандраўнай Лапо шмат пераглядаліся, размаўлялі, але я нават не падазравала, пра што. Вольга Аляксандраўна пасля сказала: «Трэба рэпеціраваць партыю Жызелі». Навошта? Ужо канец года, справаздачны канцэрт прайшоў, іспыты здадзены. Але яна настойвала. І раптам мяне сталі выклікаць у тэатр — у нас была здымка для афішы «Жызелі». І калі пачаліся рэпетыцыі ў тэатры ўжо ў канцы чэрвеня, я ўсё роўна не ўспрымала гэта сур'ёзна, да апошняга не верыла, што буду танцаваць. А ў пачатку новага сезона, ужо пры выхадзе на работу, мы сталі актыўна рэпеціраваць, і мяне пачалі выпускаць на аркестравыя «прагоны» і сцэнічныя рэпетыцыі. Вядома, гэта было складана, мой партнёр Арцём Банькоўскі нацярпеўся са мной: я ж недасведчаная, яшчэ нічога не ўмела. Са мной трэба было па сто разоў паўтараць усе падтрымкі. Але ён з разуменнем да ўсяго ставіўся. У выніку мы зрабілі гэта. Цяпер я атрымліваю велізарнае задавальненне ад таго, што танцую Жызель. Кожны спектакль як новы. Мы ўвесь час нешта змяняем, дадаем, вобраз раскрываецца па-новаму. А выява складаная. У кожнай выканаўцы свая Жызель. У кагосьці гэта гарэзлівая вясковая дзяўчына, крыху легкадумная. У кагосьці — юная летуценніца. Трэба знайсці сваю Жызель.

— А як вы шукалі?

— Я паглядзела шмат запісаў, чытала інфармацыю па балеце і лібрэта. Думала, якой можа быць Жызель, каб гэта супадала з маім унутраным светам. Шукала ў сабе нейкія рысы характару ці моманты, якія магу дадаць у вобраз. І знаходзіла. Натхнялася старымі запісамі легендарнай Галіны Уланавай. Яна мне вельмі падабаецца. Мне падабаецца і Дзіяна Вішнёва ў нейкіх момантах. Глядзела еўрапейскіх балерын. Не хацела капіраваць кагосьці. Але абапіраючыся на работы, якія ўжо існуюць, можна лепш зразумець, чаго хочаш ты.

(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)

Вехі гісторыі

СТУДАТРАДАЎСКАМУ РУХУ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА

Рэспубліканскі штаб студэнцкіх атрадаў Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі правёў конкурс на стварэнне лагатыпа, прысвечанага 60-годдзю студатрадаўскага руху ў краіне. Прыём работ скончыўся днямі.

Фота з сайта БРСМ.

Калі прыгадаць гісторыю, у 1963 годзе быў сфарміраваны Рэспубліканскі штаб студэнцкіх будаўнічых атрадаў, 2,5 тысячы беларускіх студэнтаў з 16 ВНУ краіны выехалі ва Уральскую вобласць Казахстана.

Зводны атрад удзельнічаў у будаўніцтве 362 аб'ектаў жыллёвага і культурна-бытавога прызначэння ў 41 гаспадарцы Заходне-Казахстанскага краю. У стэпе было пабудавана сто жылых дамоў, 18 інтэрнатаў, 34 культурна-бытавыя аб'екты, шэсць майстэрняў, восем школ, лазні, склады. З гэтага моманту і вядзе адлік студатрадаўскі рух у Беларусі.

Мэтай конкурсу было захаванне традыцый беларускіх студэнцкіх атрадаў і папулярызацыя іх дзейнасці. У ім маглі ўдзельнічаць усе ахвотныя грамадзяне краіны, у тым ліку мастакі-дызайнеры або іх групы. Кожны ўдзельнік мог прадставіць на конкурс не больш за тры эскізныя распрацоўкі лагатыпа.

Конкурсная работа мела быць крэатыўнай, унікальнай, адпавядаць тэматыцы, культурным, патрыятычным і эстэтычным нормам. Да ўдзелу ў конкурсе не дапускаліся работы з выкарыстаннем аўтарскіх элементаў, раней размешчаных у інтэрнэце.

Прадстаўленыя эскізы будуць ацэньвацца па наступных крытэрыях: адпаведнасць тэматыцы конкурсу, арыгінальнасць і навізна ідэі, унікальнасць графічнага рашэння, умелае выкарыстанне асноўных элементаў дзяржаўнай сімволікі і нацыянальнага каларыту ў дызайне лагатыпа, лёгкасць успрымання, пазнавальнасць і лаканічнасць выяўленчых прыёмаў, эстэтычнасць і акуратнасць афармлення лагатыпа, тэхналагічнасць і прастата тыражавання.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Даніна павагі

ПРЫГАДАЦЬ ТРАГЕДЫЮ ТОЙ ВАЙНЫ...

Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі запрасіў юнакоў і дзяўчат узяць удзел у міжнароднай асветніцка-патрыятычнай акцыі «Дыктоўка Перамогі». Асноўныя задачы праекта — вывучэнне гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і павышэнне гістарычнай адукаванасці беларускай моладзі.

Дыктоўка складаецца з 25 заданняў, якія распрацоўваў Нацыянальны інстытут адукацыі. Акцэнт у пытаннях зроблены на трагедыю ў Хатыні і генацыд беларускага народа ў гады вайны.

Кіраванне падрыхтоўкай, правядзеннем і падвядзеннем вынікаў дыктоўкі праводзіць арганізацыйны камітэт, які аказаў тэрытарыяльным камітэтам Саюза моладзі неабходную інфармацыйную і кансультацыйна-метадычную дапамогу, а таксама даў метадычныя і інфармацыйныя матэрыялы па правядзенні дыктоўкі.

Паводле папярэдніх звестак, што паступілі з рэгіёнаў і сталіцы, у асветніцка-патрыятычнай акцыі плануе ўзяць удзел 5,7 тысячы чалавек. Галоўная ўмова — выканаць усе заданні дыктоўкі асабіста.

Дыктоўка пройдзе сёння на 180 пляцоўках — у памяшканнях установ адукацыі, бібліятэк, устаноў культуры, музеяў, іншых арганізацый. Час напісання дыктоўкі — 45 хвілін. Старт — у 14.00. Перад яе пачаткам кожны ўдзельнік атрымае ў раздрукаваным выглядзе індывідуальныя камплекты матэрыялаў, у тым ліку пранумараваны бланк з заданнямі дыктоўкі і бланк для адказаў. Акрамя таго, кожнаму ўдзельніку будзе прысвоены індывідуальны ідэнтыфікацыйны нумар, які складаецца з кода вобласці, нумара тэрытарыяльнай пляцоўкі і парадкавага нумара ўдзельніка. Гэтыя даныя ўпісваюцца ў бланк адказаў да пачатку мерапрыемства.

Пасля заканчэння дыктоўкі ўсім удзельнікам будуць выдадзены памятныя дыпломы (сертыфікаты). Пераможцаў асветніцка-патрыятычнай акцыі «Дыктоўка Перамогі» вызначаць як на раённым, абласным, так і на рэспубліканскім узроўнях па максімальнай колькасці балаў, набраных за найменшы час.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Фота з сайта БРСМ.

Извещение о повторном открытом аукционе по продаже незавершенного строительством жилого дома и земельного участка в частную собственность в г. Гродно 16 мая 2023 года

№ лота	Местонахождение земельного участка, его кадастровый номер	Площадь земельного участка (га)	Характеристика (описание) незавершенного строительством капитального строения	Сумма задатка, руб.
1	Гродненская область, г. Гродно, ул. Волейбольная, 8 (У-76, микрорайон «Барановичи 5,6») 440100000003004617	0,0999	Не завершенное незаконсервированное капитальное строение наружная площадь (площадь застройки): 151 (151) кв. м. Степень готовность 11 %. Фундамент: бетон	5 300
Ориентировочные расходы по подготовке документации для проведения аукциона – 362,75 руб. Начальная цена предмета аукциона – 26 994,53 руб. (в том числе: начальная цена не завершенного строительством капитального строения – 7 623,92 руб.; земельного участка – 19 370,61 руб.)				

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».

